**Урбан В. В.** Арфаграфія / В. В. Урбан // Культура Беларусі : энцыклапедыя. Т. 1. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П.Броўкі, 2010. – С. 218.

**АРФАГРА́ФІЯ** (ад гр. *orthos* ’правільны’ і *grapho* ’пішу’), 1) сістэма агульнапрынятых правілаў напісання слоў пэўнай мовы; правапіс; 2) раздзел мовазнаўства, у якім вывучаюцца правапісныя нормы літаратурнай мовы.

Сучасная беларуская А. грунтуецца на двух асноўных прынцыпах — ***фанетычным*** і ***марфалагічным***. ***Фанетычны прынцып*** патрабуе, каб напісанне слоў поўнасцю адпавядала іх літаратурнаму вымаўленню. Паводле фанетычнага прынцыпу перадаюцца спецыфічныя асаблівасці беларускай мовы: аканне і яканне, дзеканне і цеканне, цвёрдасць шыпячых, [ц] і [р], падаўжэнне зычных і інш. Паводле ***марфалагічнага прынцыпу*** на пісьме аднастайна перадаюцца ўсе значымыя часткі слова (марфемы) незалежна ад іх вымаўлення ў розных фанетычных пазіцыях: вымаўляем [*с’ц’э́шка*], [*п’ашча́ны*], [*грама́цтва*], пішам *сцежка, пясчаны, грамадства*.

***Традыцыйны прынцып*** (традыцыйнае напісанне) А. прадугледжвае захаванне традыцыйных напісанняў, якія не могуць быць растлумачаны з пункту гледжання сучаснага вымаўлення і марфалагічнай будовы слова. Па традыцыі, напрыклад, з вялікай літары пішацца новы радок у вершаваным творы.

***Дыферэнцыяльны прынцып*** (дыферэнцыяльнае напісанне) А. патрабуе адрознення ў напісанні малой і вялікай літары, напісання слоў асобна, разам і праз злучок, якія маюць аднолькавае гучанне, але рознае значэнне: *чарот – Чарот, па волі – паволі,* у правапісе прыставак *з-* або *с-* у словах, утвораных ад дзеяслова *ісці*: *зыходзіць з меркаванняў* і *сыходзіць з ганка*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ